гэта пісана не па нашаму, а нейкай мешанай, найскарэй польскай мовай!—І гэта слова, кажэ, польскае, і гэта польскае і такое ні дзе не гаворуць на Беларусі.

Я ізноў праслухаў усё, што ён мне казаў а пасьля кажу яму: Браце, ты крытыкуеш тое, чаго няўмееш чытаць. Спёрша ты навучыся чытаць, а пасьля разумець прачытанае, а тады крытыкуй. Ты вот, як я ведаю, сем гадоў вучыўся расейскай мовы і сем гадоў вучыўся заціраць у галаве усё беларускае і аднак-жэ ня можэш быць прафэсарам расейскай мовы і крытыкам расейскаго друкаванаго слова, «славеснасці» расейскай і хіба не бярэшся за гэта, бо ведама, што цябе высьмеялі-бы, каб ты пачаў гэта рабіць. Чаму ж ты не падумаеш, што гэтак сама бяручыся крытыкаваць беларускую літэратуру, выстаўляеш сябе на пасьмешышчэ: ты-ж сам перш падчорківаў тое, што чытаць ня ўмееш!

— Расейская мова, — кажэ, — што іншае, а беларускую я знаю змалку, мой бацька і дзед па беларуску гаварылі.

— То хіба-ж, — атказываю яму я,—і у Расеі дзяды і бацькі расейцоў не па татарску гаворуць, а гаворуць па расейску, а аднакжэ там па ўсіх школах вучацца дзеці па расейску ня толькі чытаць і пісаць, але і разумець прачытанае і напісанае. У нямеччыне немцы гэтак сама вучацца нямецкай мовы, у Франції—французкай і т. д. І вучацца сваей роднай мовы людзі да старасьці, да сівых валасоў. Гэтак сама і беларус сваей роднай мовы павінен вучыцца, а ты хочэш, каб дзеля таго толькі, што тваe бацькі гаварылі па беларуску, а ты палавіну свайго жыцьця нагамі і рукамі, як відаць, бароніўся ад беларускай мовы, быць крытыкам беларускай славеснасці, навучаць другіх.

І ці думаеця, дарагіе чытачы, я перэканаў свайго сябра? Не, ён астаўся пры сваім, што ён ведае беларускую мову (хоць гаварыць і адвык) і мае права крытыкаваць літэратуру, каторая па ягонаму „польшчынай пахне“ Парайце-ж як памагчы зразумець яму гэта, як,—дзякуй ягомасцям«Я. Л.» і Лявону Гмыраку,—параілі Аргусу, што рабіць з няверным Хамой с Піншчыны.

**Піліп Дубчонак.**

# Праўдзівы шлях.

Апошнімі часамі паміж тутэйшай жыдоўскай інтэлігенціі пачаўся цікавы рух. Прадсваўнікі гэтаго руху у першай кніжцы свaей часопісі „Літва“ (друкуецца па жыдоўску), кажуць, што інтэлігенты жыды цікавяцца усім, усякімі народамі і мовамі да.. якутоў, — але ні тутэйшай мовы, ні народу,—паміж каторага яны жывуць тысячу, калі ня злішкам лет — не знаюць. Жыдоўскіе карэспанданты у гандлёвых фірмах умеюць напісаць пісьмо на колькі чужых мовах, але бадай німа паміж імі ніводнаго каторы патрапіўбы напісаць, бяз грубых абмылак, ліст або цыркуляр па літоўску ці па беларуску. Адным словам ідэйная група жыдоў, каторые зжыліся і палюбілі гэты наш край, заклікаюць сваё грамадзянства прыбліжацца да мейсцовых дэмократычных народоў як беларусы і літвіны, пазнаваць іх мову, гісторыю і быт ды разам працаваць дзеля лепшай будучыны.

Ня можна не віншаваць тых, каторые выйшлі с паміж жыдоўскаго грамадзянства, каб сеяць гэткіе думкі між сваімі. Дагэтуль мы сустрэчалі у Беларусі двох тыпоў жыдоў: старых і маладых, — старые жыды у большай сваей частцы гэта людзі прайшоўшые цяжкую школу жыцьця, праведшые зазвычай жыцьцё у стасунках з мейсцовым народам і зжыўшиеся з ім. Не глядзя на закараніўшыйся паміж імі рэлігійны і нацыональны фанатызм яны усё-ж такі далёка лепшымі яўляюцца нашымі суседзямі і грамадзянамі го, бо крэпка трымаючыся свайго, не абрасеівалі нашаго селяніна. Другі, новы тып жыдоў—гэта маладзейшае пакаленьне узгадванае па гарадох, пад вялікім уплывам расейскай культуры. Гэты тып саўсім чужым стаўся народу і ні народ іх. ні яны народу не разумеюць. Створэный векамі контакт мейсцовых народоў з жыдамі і жыдоў з мейсцовымі народамі, яны часта густа не пачуваючы таго самі, руйнавалі на кожным кроку і гэткім парадкам народы пражыўшые тысячу гадоў с сабой, ставаліся сабе што раз болей чужымі.

І вось гэты новы кірунк у жыдоўскай грамадзянскай думцы — гэта той праўдзівы шлях, каторым калі захочэ пайсці жыдоўскае грамадзянства, давядзе нашу старонку да так чэканай усімі бяз дольнікамі лепшай будучыны.

У „Літве“ ёсць перэклады на жыдоўскую мову з беларускай і літоўскай літэратуры і абшырные стацьці пасьвячэные краеваму пытаньню. **Тутэйшы.**

# Яйцо нас збагаціць.

Хто ня ведае. што наш селянін мала мае карысціс курэй. Гадамі вядзецца. што курынные яйкі, гэта бабскі прыбытак, найбольш нясуць бабы іх у вясковую краму, дзе іх меняюць на мыла, газу, селядцы, табаку. Бяз гэтаго селянін цяпер не пражыве, бо калі грошы у кішэні не чутно, яйкі ідуць крамніку за грошы, кожнае па капейцы лічыцца. Выгода аднаму крамніку, бо за яйцо ён дае пакупцу аркуш, найбольш два, цыгаркавай паперы, каторай у гарадзе 3—5 аркушоў на капейку купіш ды і лепшаго гатунку; за 10 яец даюць у краме кусок мыла, вартый 5—6 капеек. Ласые на цукеркі дзеці руняцца падпільнаваць спад курыцы яйцо, збяруць іх два-тры і цягнуць крамніку меняць на цукеркі. Толькі дамавітые гаспадыні стараюцца збіраць яйкі і прадаюць іх пасьля па 12—15 капеек дзесятак перакупшчыку, што ездзіць па сёлах, а калі у сьвята выбярэцца у места (у горад), то і па 18—20 капеек. Добра гэта ведаюць вясковые гаспадыні, лаюць крамніка, а праз дзень ізноў да яго бягуць. А той збірае яйкі тысячамі, часамі на мейсцы перакупшчыку прадаець, зарабіўшы на іх бяз клопату добрые грошы, найбольш жэ вязе у горад, ці атсылае далей куды па чыгунцы, прадаючы ешчэ з большай карысцю

Папытайцця якога небудзь гаспадара, сколькі за год мае прыбытку з яец, кожын скажэ, што ня больш як 7—10 рублёў, ды і тых не бачыў. між рук прайшлі. Сярэдняя гаспадарка мае 15—20 курэй, хто багацей, то і болей; дадуць гэтые куры тысячу, або паўтары тысячы яец найменш; лічучы па 18—20 капеек дзесятак, за год мелі-б прыбытку ад 18 да 30 рублёў. А гэтэ ужо не малые грошы у селянскай гаспадарцы.

За 1911 год з Расеі вывезлі заграніцу яец на 80 мільёноў 473 тысячы рублёў і у 1909 гаду яйкі займалі чацьвёртае мейсцо у вывазе заграніцу. пасьля пшаніцы, ячменя і лесу. З гэтаго усякі зразумее, што гадоўля курэй рэч прыбытная і пры другіх парадках бадай усе 80 мільёноў засталіся-б у кішэнях сельскіх гаспадароў.

Там дзе зямельная гаспадарка не дае вялікіх даходоў, селяне пачалі брацца за гадоўлю курэй, гусей, індыкоў і у Падольскай губэрні, напрыклад, сярэдняя гаспадарка збірае у год па 5—6 тысяч яец. Гадамі тамтэйшы гаспадар з яец мае 120—150 рублёў... што году, чаго ён іншы раз не мае і з зямлі.

Цяпер папрабуем палічыць сколькі грошы не дабірае вясковы гаспадар на яйцах. Вясной і летам, як прызнаюць самі перакупшчыкі, яны зарабляюць ад 3 да 7 рублёў с тысячы яек; зімой-жэ і найболей восеньню, калі падвозу у горад мала, або і саўсім німа праз бездарожжа, перакупшчыкі маюць прыбытку да 10 рублёў с тысячы; сярэднім яны зарабляюць па 5 руб. с тысячы. Гэта перакупшчык, а крамнік і—таго болей, бо зарабляе у двая,—пры 14 рублях цаны за тысячу яек яго заработак 7 рублёў ня меней. Злічылі, што за адзін толькі 1905 год на яйках селяне не дабралі 15 мільёноў рублёў, за дзесяць жэ гадоў, ад 1900 па 1909 году—107 мільёноў рублёў — гэтые грошы трапілі у кішэні перакупшчыкоў.

(*Далей будзе*).

**Наз. Бываеўскі.**

# Малые дравасекі.

Зімовы дзень блішчыць тысяччу агнямі.

Крэпкі мароз. Сьнег пад нагамі скрыпіць, як жывы.

Пад белай пакрывай сьнегу, як задум лённы старэц, стаіць сасновы бор

Ціха, пуста. Толькі грук дравасекоў ня сецца па ваколіцы.

Трах—трах—трах—трах!—чуваць з высо каго бору.

Ешчэ здалёку можна прымеціць, як блішчыць пад сонцэм піла, а абапол матулі-сосны стаяць, як мурашкі, двох маленькіх хлопчыкоў.

Яны махаюць рукамі гэтак шпарка, што лахманы іхніх падраных абноскаў разьвеваюцца і аткрываюць голае цела..· Але піла усе глыбей ды глыбей уедаецца у сэрцэ сосны і.., трах—павалілася! І с пад густога сьнежнаго курадыму панёсся расцяглы стогн...

Малые дравасекі былі браты. Старшаму—Цішку было дзесяць гадоў, меншаму—Халімону—восем гадоў.

Іх бацькa, — храмы Цыпрук,—быў пьяніца; жонку і дзяцей трымаў пад свой цьвік: карміў іх больш лупцоўкамі, як хлебам.

Выпраўляў храмы Цыпрук хлопчыкоў да купца у лес на заработкі, а грошы забіраў сабе і прапіваў...

Трудна жылося малым дравасекам, але што зробіш? — Дзякаваць Богу, што бацька хоць на палудзень даў па кавалку хлеба...

Паваліўшы неколькі сосен хлопчыкі узяліся шчыра грызьці сухі хлеб, — вочы іх зайскрыліся, шчочкі расчырванеліся...

— Ого, есьці, ого!.. Якое шчасьце!.. ды ешчэ далёка ад бацькоўскага крыку. Але ешчэ не кончылі яны палуднаваць як ўзнялася завея, мяцеліца.

Застагнаў, засвістаў высокі бор. Пачаў кружыцца белы сьнег. Бытцым белае морэ, бытцым белые коні, насіліся цэлые гурбы... Страшна было у бары.

Усе дравасекі разбегліся барджэй дамоў, а Цішка с Халімонам баяліся каб бацька не крычэў на іх, што зарана прыйшлі з лесу... Селі пад вялікай сосьнай, прытуліліся адзін да другога, як малые птушкі, і дрыжэлі...

— Баюся!—усхліпаў меньшы Халімон.

— Во, дурэнь, чаго баяцца!—Цешыў яго большы Цішка:—Зара дамоў пойдзем!

— Дамоў пойдзем! — Заенчыў Халімон. І яны пайшлі.

Стагнаў і плакаў бор. але ешчэ можна было ісці, а на чыстым полі—Матухна Божа!—Сьвету не відаць было. Толькі бачылі малые дравасекі, як белые клубы зьмеямі звіваліся, дыхалі холадам на іх ды сыпалі шротам па тварыках...

Хадзілі, хадзілі, - брылі, брылі але куды і самі ня ведалі...

Змарыліся. Агарнула ноч, сьнег дайшоў вышэй пояса.

— Ляжэм!—сказаў меншы Халімон.

— Ляжэм!—атказаў большы Цішка.

І ляглі. Моцна, моцна прытуліліся адзін да другога і ўсплакалі пакуль мелі сілы.

Але.. зрабілося гэтак цёпла...

Або-о о! сідзяць за сталом... маці радуеца, што прыйшлі... падала цёплы прэснак.. Бацька сядзіць лагодненька... Пад'елі, памаліліся і ляглі на палок каля печы.. Котка ласілася да іх і яны радасна заснулі..

. . . . . . . . . . . .

У поўнач пацішэла мяцеліца. Выглянуў чырвоны месяц і ўкруг яго танцавалі зоркі, пазіраючы на белую зямлю.

Толькі на трэцьці дзень аткапалі малых замёрзшых дравасекоў.

**Зьмітрок Бядуля.**

# ЗЛАЯ БАБА.

Ажаніўся Кузьма з вясковай дзяўчынай Параскай. і як не ажаніцца калі яна хоць і ня вельмі ладная, — нос мела як цыгарку, а твар ад воспы хоць тынкуй,—але дужа ласкавая была і так умела прылашчыцца да Кузьмы, што ён не зважаючы на людзкіе языкі узяў яе замуж.

Як толькі прывёў Кузьма жонку Параску у сваю хату, дык яна і выпусьціла свае капцюркі: зрабілася з лагоднай і прытульнай дзяўчынкі -чыстая ведзьма.

У хаці работы ані на грош, а толькі ад суседкі да суседкі с плёткамі бегаіць. А як прыляціць дамоў, то на мужа: — ты такі, ты гэткі; ты гультай ты калодка: нічога ня робіш і нічога не маіш.

Цярпеў, цярпеў Кузьма, ды ня ўцерпіў: узяў ды павесіўся.

І як гэта усім ведама—вісельнікі на тым сьвеці ідуць проста у пекла. Прыйшоў і Кузьма у пекла. Чэрці дапытаўшыся у яго якой ён сьмерцью памёр і даведаўшыся, што вісельніцкай, давай яго падскварываць самымі горшымі мукамі, а ён толькі сьмеецца: яго і на патэльні скварыць і у катле з смалаю варуць, а ён усё сьмеецца.

Пайшлі чэрці да Люцыпара і кажуць:

Гэтаму вісельніку німа ніякай рады: мы яму ужо што найгоршые мукі задавалі а ён усё толькі сьмеецца.

